УДК 7.046.1

Барадзін Ю. С.

# ГЕНЕАЛОГІЯ ДЫСКУРСА ВІКІНГАЎ У СУЧАСНАЙ МАСАВАЙ КУЛЬТУРЫ

*Навуковы кіраўнік: Крывалап А. Д., дацэнт,*
*кандыдат культуралогіі*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

У артыкуле разглядаецца прааналізаваны міфалагічны дыскурс вікінгаў на падставе генеалогіі і дыскурса французскага філосафа – Мішэля Фуко. Выяўленыя напрамкі дыскурсу скандынаўскай міфалогіі ў сучаснай масавай культуры.

**Ключавыя словы:** генеалогія, улада, міфалогія, вікінгі, дыскурс, абмеркаванне, паведамленне

Borodin Y. S.

# GENEALOGY OF VIKING DISCOURSE IN MODERN MASS CULTURE

*Scientific Supervisor: Krivolap A. D., Associate Professor,*
*Candidate of Cultural Studies*
*Belarusian State University of Culture and Arts*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The article deals with the analyzed mythological discourse of the Vikings based on the genealogy and discourse of the French philosopher Michel Foucault. The revealed directions of the discourse of Scandinavian mythology in modern mass culture.

**Keywords:** genealogy, power, mythology, vikings, discourse, discussion, message

У канцы XX, пачатку XXI ст., у сусветную, беларускую і сучасную, масавую культуру вяртаецца пантэон скандынаўскіх багоў, у якіх верылі вікінгі. Французскі філосаф – Мішэль Фуко з'яўляецца тэарэтыкам ідэі дыскурсіўнасці, затым разглядае дыскурс як мову і сутнасць культуры. Расійскі культуролаг – Ю.М. Лотман разглядае міф як тэкст (інфармацыя), мову (камунікацыя) і дыскурсіўнае мысленне (міфалагічнае мысленне, спробы суаднесці міф з сучасным) [4]. К.Леві-Строс разглядае міф як стварэнне дыскурса ў выглядзе моўнай (вуснай) літаратуры [5, с. 184].

Дыскурс, на думку, Фуко – гаворка ня толькі слоўная. Праз звяртанне да язычніцкай міфалогіі старажытных грэкаў, у навуковым дапаможніку «Дискурс и истина» Фуко стварае паняцце «міфалагічны дыскурс» [12, с. 34]. На падставе дыскурсу Фуко ствараецца генеалогія дыскурсу вікінгаў праз скандынаўскую міфалогію, якая ёсць неад'емнай часткай культуралогіі. Зыходзячы з таго, што сама культура - прастора для дыскурса, можна прыйсці да высновы, што генеалогія вікінгаў у масавай і беларускай культуры – частка дыскурсіўнага аналіза.

Ёсць моўны (вусны) дыскурс, калі людзі размаўляюць і вядуць дыялог. Напрыклад, язычніцкі пантэон скандынаваў, у якіх верылі вікінгі, іх уплыў на сучасную масавую культуру, уваходзіць у дыскурсіўнае абмеркаванне паміж гісторыкамі, навукоўцамі, даследчыкамі, і тымі, хто праяўляе цікавасць. Ёсць пісьмовы дыскурс, калі адзін чалавек з іншым абменьваецца паведамленнем альбо інфармацыяй. У сённяшні час, падкрэслівае Фуко, сапраўдным дыскурсам, які мае адносіны да ісціны, з'яўляецца менавіта той, які абапіраецца на навуковыя даследаванні. Напрыклад, навукова-даследчы артыкул пра вікінгаў у беларускай культуры належыць да дыскурсу. Альбо, праз навукова-дакументальныя творы ідзе працяг новых даследаванняў.

Праз дыскурсіўную супольнасць людзі маюць права на той ці іншы дыскурс. Пісьменнікі, якія пішуць мастацкую літаратуру альбо гісторыкі і навукоўцы, якія пішуць навукова-дакументальную літаратуру, ствараюць дыскурсіўную супольнасць у прасторы культуры. Падчас чытання навуковай і мастацкай літатары паміж чытачом і аўтарам таксама паўстае дыскурс, паколькі дыялог як стратэгія аўтарскага дыскурсу. Паўстае навуковая альбо мастацкая камунікацыя, калі дыялог тэкста-дыскурса далучае ў дыялог ня

толькі герояў твору, але і чытача праз стварэнне агульначалавечай асновы і разумення зносін. У мастацкай літаратуры падобны літаратурны дыскурс ствараюць расійская пісьменніца – Марыя Сямёнава – аўтар твору «Викинги» [6, с. 6] і «Месть сыновей викинга» [13, с. 459] усталёўваюць сувязі паміж мастацкім тэкстам, аўтарам, чытачом, традыцыямі і генеалогіяй вікінгаў, апісваючы радавод нацыянальнага героя Скандынавіі – Рагнара Лодбрака і яго сыноў: Б'ёрна Жалезнабокага, Івара Бескасцёвага, Хальвдана Вітсэрка, Уббы і Сігурда Змеявокага. Ісландскія пісьменнікі – Сноры Стурлусан – аўтар «Малодшай Эдды» [7, с. 6] і Сэмунд Мудры – аўтар «Старэйшая Эдды» [10, с. 13], і іх перакладчык на беларускую мову Яўген Папакуль у «Эддзе Сноры Стурлусана» [8, с. 269] і «Песнях пра багоў» [9, с. 203] ствараюць міфалагічны дыскурс паміж скандынаўскімі багамі, у якіх верылі вікінгі і тымі, хто праявіў цікавасць да культуры вікінгаў. Французскі міфолаг – Жорж Дзюмезіль у творы «Верховные боги индоевропейцев» на прыкладзе іншых міфолагаў стварае навуковы дыскурс паміж тым, хто даследаваў раней і хто даследуе скандынаўскую міфалогію сёння [3, с. 141].

Фуко адносіць да дыскурсу рэлігійную і палітычную дактрыну, якая арганізуе дыскурс і з'яўляецца часткай культуры вікінгаў.

Частка палітычнай дактрыны ў скандынаўскай культуры – генеалогія ўлады, на якую абапіраецца Фуко [11, с. 10]. Дэмакратыя, падкрэслівае французскі філосаф, ствараецца на роўнасці, згодна якой народ ажыццяўляе ўладу, і ўсе аднолькава роўныя перад законам [12, с. 70]. Скандынавія эпохі вікінгаў стала ўзорам для дэмакратыі ў Еўропе. Конунг у скандынаваў быў вышэйшым правадыром, якога абіраў народ. Акрамя касты ваяроў, конунгу падпарадкоўваліся ярлы (іншыя вышэйшыя саслоўі скандынаваў). Усе праблемы і пытанні скандынаўскія народы (нарвежцы, шведы, датчане і ісландцы) выражалі на чале з кіраўніком у народным сходзе «тынг» (скандынаўскі варыянт беларускага і славянскага «веча», што таксама стварала адносіны і дыскурс паміж народам і ўладай яшчэ ў эпоху ранняга сярэднявечча (VIII-XI стст.). Закон у скандынаваў эпохі вікінгаў быў перад усім. Парушальнікаў закону, альбо тых, хто яго пераступіў, здзейсніўшы злачынства, судзілі і выносілі адпаведны прысуд: выгнанне з грамады, канфіскацыя маёмасці (чалавек па-за законам) альбо смяротнае пакаранне. Забойства

чалавека без суду і сведкаў лічылася таксама лічылася злачынствам. Калі паміраў конунг альбо ярл, працягваючы радавод, сын атрымоўваў ў спадчыну пасля смерці бацькі ўладу над конунгствам (скандынаўскім каралеўтсвам) альбо ярлствам і ўсе яго валоданні. Часткай генеалогіі ўлады з'яўляюцца скандынаўскія багі, паколькі яны адыгрываюць значную ролю ў касмагоніі (стварэнні свету). Паколькі, багі вікінгаў такія ж смяротныя як людзі, і ім уласціва паміраць, а разам з імі ў дзень «Рагнарок» загіне стары свет скандынаваў, над новым адроджаным светам уладу ўспадкуюць сыны Одзіна (Бальдр, Хёд, Валі і Відар) і ўнукі Одзіна, сыны Тора (Магні і Модзі). Працяг генеалагічнага дрэва скандынаўскіх багоў таксама з'яўляецца часткай генеалогіі дыскурсу вікінгаў.

У рэлігійную дактрыну міфалагічнага дыскурсу ўваходзіць язычніцкі пантэон багоў, іх паходжанне, і функцыі, якія яны выконваюць: Буры (першачалавек дзед Ўсебацькі Одзіна), яго сын – Бор, Одзін і яго браты – Ві і Велі (стваральнікі скандынаўскага космасу), сыны Одзіна - Тор (грамабой з молатам «Мельёнір»), Бальдр (бог вясны), Валі і Відар (багі помсты), сыны Тора - Модзі (бог ваяўнічай лютасці), Магні (бог фізічнай сілы), дзеці вана Ньёрда – Фрэйр (бог сонца і лета) і Фрэйя (багіня вайны і любові). Імёны багоў з скандынаўскага пантэону даносяць праз паведамленне ў мастацкай літаратуры, у культавых амерыканскіх фільмах [1] і серыялах пра скандынаўскіх ваяроў [2], у сучаснай музыцы вікінгаў (nordic folk [14], viking metal[15]), дзе таксама ствараецца міф як форма існавання дыскурса.

У міфалагічным дыскурсе гаворка ідзе аб прасторы, якой кіруюць багі, і пры гэтым з'яўляюцца нябачнай для нас сілай. Паколькі, сутнасць міфалагічнага дыскурса – ня толькі ўсталяванне камунікацыі праз мову, але і імкненне даказаць, што на зямлі ўсё, што робіцца, не само па сабе, і ня проста так, а па волі багоў, якія свет стварылі і ім кіруюць, людзі прыходзяць такім чынам да высновы, што ў свеце адбываюцца важныя і незалежныя ад чалавека падзеі, што робіць жыццё асэнсаваным. Большасць даследчыкаў схіляецца да думкі аб тым, што міфалагічны светапогляд як частка нацыянальнай культуры і самасвядомасці актульны па сённяшні дзень для культуралогіі і для сучаснага чалавека. З дапамогай міфалагічнага дыскурсу сам міф прадстаўлены з пазіцыі філасофскага асэнсавання. Такім чынам, міфалагічнае мысленне праз

дыскурс рэканструюецца ў навуковым і мастацкім тэксце, дзе будуюцца фрагменты і сюжэты, праз якія спачатку з хаосу і змроку з'яўляюцца першапродкі багоў, затым імі пабудаваны скандынаўскі свет. Літаратура, фільм і музыка – камунікатыўная з'ява як форма дыялогу аўтара з чытачом, слухачом і гледачом, што дазваляе разглядаць міфалогію як дыскурс.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Величайшие фильмы про викингов [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://film-like.com/spisok/603-velichayshie-filmi-pro-vikingov. – Дата доступу: 30.03.2023.
2. Викинги (сериал) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vikingi.live/jo/. – Дата доступу: 30.03.2023.
3. Дюмезиль, Ж. Верховные боги индоевропейцев / пер. с франц. Т.В. Цивьян, М.: Наука, 1986. — 234 с.
4. Исследование мифа [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://s.econf.rae.ru/pdf/2016/04/5373.pdf. – Дата доступу: 30.03.2023.
5. Леви – Строс, К. Структурная антропология: пер с франц. Иванова В.В / под общ. ред. Н.А. Бутинова, В.В. Иванова. – М.: Наука, 535 с.
6. Семёнова, М. Викинги: Сборник. – М.: ООО Изд-во АСТ; СПб: Азбука, 2001. – 592 с.
7. Младшая Эдда / Пер. с древнеисл. О.А. Смирницкой. – Ленинград: Наука, 1970. – 253 с.
8. Папакуль, Я. Эда. Песні пра багоў. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 312 с.
9. Папакуль, Я. Эда Сноры Стурлусана. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 298 с.
10. Старшая Эдда: Эпос / Пер. с древнесл. А. Корсуна. – СПб.: Азбука, 2000. – 464 с.
11. Фуко, М. Археология знания; пер. с франц. С. Митина, Д. Стасова / Общ. ред. Б. Левченко. – К.: Ника-Центр, 1996. – 208 с.
12. Фуко, М. Дискурс и истина / Пер. с англ. А.М. Корбута / Белорусский государственный университет, Центр проблем развития образования. – Мн.: Пропилеи, 2006. – 152 с.
13. Хольм, Л. Месть сыновей викинга / Лассе Хольм. – М.: АСТ, 2019. – 475 с.

14. Viking & Nordic Folk Music [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vk.com/viking_nordic_folk_music. – Дата доступу: 08.01.2023.
15. Viking Metal Artists [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.last.fm/tag/viking+metal/artists. – Дата доступу: 08.01.2023.